Русак В.П. Марфаналогія словазмянення і словаўтварэння сучаснай беларускай мовы. Мінск: Беларуская навука, 2012.

Адной з асабівасцей сучаснага мовазнаўства з’яўляецца імкненне да аднастайнага апісання мовы на ўсіх узроўнях, што абумоўлівае вывучэнне пераходных з’яў на сумежжы розных лінгвістычных дысцыплін. Да такіх з’яў адносіцца ў прыватнасці марфаналогія – раздзел мовазнаўства, які ўзнік у пачатку XX ст. на мяжы фанетыкі і марфемікі. Асноўным аб’ектам гэтага дастаткова маладога раздзела навукі пра мову выступае чаргаванне фанем у морфах адной марфемы (пры словазмяненні) ці ў асновах матывавальнага і матываванага слоў (пры словаўтварэнні).

Марфаналогія шукае і дае адказы на вельмі важныя сучаснай лінгвістыкі. Сведчаннем гэтаму і з’яўляецца манаграфія Валянціны Паўлаўны Русак “Марфаналогія словазмянення і словаўтварэння сучаснай беларускай мовы”.

Каштоўнасць і значнасць манаграфіі вызначаецца тым, што ў ёй разглядаюцца тэарэтычныя, метадалагічныя, метадычныя і тыпалагічныя праблемы.

Ва ўводзінах і першай частцы “Марфаналагічная праблематыка ў сучасным мовазнаўстве” распрацоўваюцца такія важныя агульнатэарэтычныя пытанні, як прадмет марафаналогіі, яе месца ў сістэме іншых лінгвістычных навук, этапы развіцця марфаналогіі на Беларусі, размежаванне марфаналагічных і фанетычных чаргаванняў і інш. Асобны раздзел уводзінаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прысвечаны тлумачэнню асноўных тэрмінаў і паняццяў марфаналогіі. Усё гэты дазваляе вызначыць месца марфаналогіі ў сучаснай навуцы пра мову, раскрыць яе значнасць і спецыфіку.

Наступныя пяць частак манаграфіі прысвечаны аналізу практычнага матэрыялу. Для вызначэння месца марфаналагічных з’яў у апісанні мовы выяўляюцца, якія звесткі пра мову варта лічыць марфаналагічнымі і на падставе якіх крытэрыяў яны ўстанаўліваюцца і выдзяляюцца, высвятляецца, якая з фаналагічных характарыстык мае марфаналагічныя ўласцівасці, аналізуецца выкарыстанне марфалагічных альтэрнацый для выражэння розных граматычных катэгорый, устанаўліваецца рэестр зменных адзінак марфемы, вызначаецца іх функцыянальная нагружанасць.

У другой частцы “Марфаналогія словазмянення” разглядаюцца марфаналагічныя з’явы ў парадыгматыцы дзеясловаў, назоўнікаў, прыметнікаў і лічэбнікаў, у прыватнасці апісваюцца кансанантныя чаргаванні каранёвай марфемы, чаргаванні галосных фанем, падоўжаныя зычныя і інш., выяўляюцца рэгулярныя і нерэгулярныя чаргаванні, вызначаецца іх функцыянальная нагружанасць.

У частцы “Марфаналогія словаўтварэння” размяжоўваюцца паняцці матываванага і матывавальнага слова, вылучаюцца марфаналагічныя змены асноў матывавальных слоў, асобна апісваюцца марфаналагічныя з’явы пры аддзеяслоўным, адназоўнікавым, адпрыметнікавым словаўтварэнні і словаўтварэнні прыслоўяў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Часткі чатыры і пяць прысвечаны марфаналагічнай класіфікацыі дзвюх асноўных часцін мовы - дзеяслова і назоўніка: даюцца падставы класіфікацыі, апісваюцца марфаналагічныя класы дзеясловаў і марфаналагічныя тыпы назоўнікаў.

Частка шэсць "Марфаналагічны аспект засваення новых слоў сучаснай беларускай мовы" прысвечана пытанням культуры маўлення.

Грунтоўнасць тэарэтычных выкладак падмацоўваецца вялікім практычным матэрыялам: толькі марфаналагічнае апісанне дзеяслова грунтуецца на аналізе 14 тысяч лексем. Значная частка практычнага матэрыялу змешчана ў дадатках, дзе можна знайсці варыянтныя субстантыўныя словаформы пры чаргаванні галосных фанем з нулём галоснай у множналікавых назоўніках, назоўніках агульнага роду, назоўніках жаночага роду.

Тыпалагічны аспект кнігі абумоўлены тым, што пэўныя заканамернасці чаргаванняў марфем пры словаўтварэнні і словазмяненні могуць разглядацца як спецыфічныя рысы пэўных моў. Сам тып прадстаўленых чаргаванняў, вызначэнне іх функцый, іх выкарыстанне пры маркіраванні асобных класаў слоў стала прадметам тыпалагічных супастаўленняў і класіфікацый. Такім чынам праца В.П.Русак уносіць уклад у тыпалагічнае вывучэнне моў.

Манаграфія будзе карыснай не толькі даследчыкам праблем агульнага і тэарэтычнага мовазнаўства, але і выкладчыкам беларускай мовы, студэнтам-філолагам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Матэрыял, прадстаўлены ў даследаванні можа быць выкарыстаны пры вывучэнні такіх раздзелаў мовазнаўства, як фанетыка, марфеміка, словаўтварэнне, марфалогія. У кнізе В.П.Русак можна знайсці адказы на пытанні, якія ўзнікаюць пры правядзенні фанетычнага, марфемнага і словаўтваральнага разбораў слоў, у прыватнасці пытанні пра межы марфемы, варыянты марфем, статус падоўжаных зычных і г.д.. На асобныя палажэнні манаграфіі будуць неабходнымі пры засваенні арфаэпічных, акцэнталагічных і арфаграфічных норм беларускай мовы.

Апісанне марфаналагічных з’яў у гістарычным аспекце, з аднаго боку, будзе карысным для тлумачэння фактаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы, а з другога, знойдзе прымяненне пры вывучэнні стараславянскай мовы і гісторыі мовы.

Аналіз дыскусійных пытанняў марфаналогіі, размежаванне падыходаў Маскоўскай і Ленінградскай фаналагічных школ могуць быць выкарыстаны на занятках па мовазнаўтсве.

Такім чынам, вынікі даследавання Валянціны Паўлаўны Русак будуць садзейнічаць разуменню працэсаў змянення структуры слова пры словаўтварэнні і словазмяненні, знойдуць прымяненне ў практычнай рабоце настаўнікаў школ і выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў, а кніга можа стаць падручнікам для студэнтаў і аспірантаў філалагічнага профілю.

Рэцэнзенты –
кандыдаты філалагічных навук, В.У.Азарка
дацэнты кафедры беларускага і рускага
мовазнаўтва А.С.Васілеўская

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ